# ІНФАРМАЦЫЯ
## аб выніках рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) у 2017 годзе

*Праграмы накіраваны на развіццё высокатэхналагічных галін эканомікі, транспартнай інфраструктуры і прадпрымальніцтва,
захаванне прыродных рэсурсаў,
фарміраванне інфармацыйнага грамадства,
стварэнне спрыяльнага асяроддзя для жыцця,
умацаванне здароўя і сацыяльнай абароны насельніцтва,
забеспячэнне даступнасці і якасці адукацыі,
павышэнне культурнай і турысцкай прывабнасці*

Рэалізацыя мерапрыемстваў **20 дзяржаўных праграм**[1], пералік якіх зацверджаны Урадам, накіравана на выкананне задач Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады.

Аналіз справаздач аб выніках рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) за першыя два гады пяцігоддзя сведчыць, што **бягучае выкананне іх мерапрыемстваў у цэлым дазваляе забяспечыць выхад на задачы, прадугледжаныя Праграмай – 2020.**

У прыватнасці:

***у сферы будаўніцтва***:

павялічана забяспечанасць насельніцтва жыллём у разліку на аднаго жыхара па выніках 2017 года да 27 кв. м (задача на 2021 год – 27,3 кв. м);

уведзена ў эксплуатацыю 8 078,2 тыс. кв. м жылля (з іх у 2017 годзе – 3 792,5 тыс. кв. м жылля пры заданнні 3 500 тыс. кв. м), у тым ліку з дзяржаўнай падтрымкай каля 1 578 тыс. кв. м (у 2017 годзе – каля 588 тыс. кв. м);

сярэдні кошт аднаго квадратнага метра агульнай плошчы жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай (без уліку індывідуальных забудоўшчыкаў), склаў 784 рублі. Гэта дазволіла наблізіць суадносіны сярэднемесячнай заработнай платы і кошту аднаго квадратнага метра (факт – 86 %);

забяспечаны рост долі індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ў агульным аб'ёме жыллёвага будаўніцтва да 46,7 % (Праграмай – 2020 прадугледжана дасягненне 40-працэнтнага значэння да 2020 года);

***у сферы інфарматызацыі:***

завершаны трэці этап стварэння адзінай сеткі сотавай сувязі стандарту LTE (уведзена ў эксплуатацыю 487 базавых станцый, што дазволіла павялічыць ахоп насельніцтва паслугамі сотавай рухомай сувязі стандарту LTE з 41,5 да 68,5 %);

---

[1] Па Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады прадугледжаны асобы парадак маніторынгу.

уведзена ў эксплуатацыю 7,5 тыс. км валаконна-аптычных ліній сувязі, агульная колькасць абанентаў, падключаных па тэхналогіі GPON, павялічылася ў 2017 годзе на 610 тыс. і склала 1,7 млн.;

забяспечаны доступ да глабальнай сеткі інтэрнэт 73,5 працэнта дамашніх гаспадарак;

працуе сістэма «Разумны дом», у межах якой ажыццяўляецца інтэлектуальнае кіраванне домам (гэтай паслугай карыстаецца 15,3 тыс. абанентаў);

усталяваны ў межах праекта «Электронная школа» сэрвісы электронных дзённікаў і электронных журналаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі (ахоп склаў больш за 20 працэнтаў);

***у галіне ўстойлівага развіцця рэальнага сектара эканомікі і рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў:***

павялічана да 53,7 працэнтаў (у грашовым выражэнні) доля айчынных лекавых сродкаў на ўнутраным рынку;

узрасла да 28 працэнтаў доля экспарту ў агульным аб'ёме вытворчасці лекавых сродкаў;

дасягнуты прырост экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання на 16 працэнтаў (пры заданні на 6,5 працэнта);

павялічана рэнтабельнасць продажу ў сельскагаспадарчых арганізацыях з 2,7 працэнта ў 2016 годзе да 6,5 працэнта ў 2017 годзе;

уведзена ў эксплуатацыю ў 2017 годзе 34 энергакрыніцы, якія працуюць на мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсах, сумарнай цеплавой магутнасцю 115,24 МВт (план – 27 крыніц сумарнай цеплавой магутнасцю 100,24 МВт); у 2016 годзе – 26 энергакрыніц (59,8 МВт);

сэканомлена 1,034 млн. тон паліўна-энергетычных рэсурсаў. Доля мясцовых ТЭР у валавым ужыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў узрасла на 1 працэнтны пункт і склала 15,6 працэнта, доля мясцовых крыніц энергіі ў валавым ужыванні ТЭР дасягнула ўзроўню 6,2 працэнта (пры плане 5,7);

скараціўся аб'ём выкідаў парніковых газаў да 91,0 млн. тон (пры плане 91,8 млн. тон) і забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных і мабільных крыніц (1 243,0 тыс. тон пры плане 1 245,0 тыс. тон);

***у сферы жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадаркі, транспарту:***

зніжаны выдаткі на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву на 5,7 % (у адносіах да 2016 года);

забяспечаны ўвод 5 011,8 тыс. кв. м агульнай плошчы жылых дамоў пасля капітальнага рамонту (з іх у 2017 годзе – 2 640 тыс. кв. м), а таксама замена і мадэрнізацыя ў жылых дамах 1 070 ліфтоў (654 адзінкі ў 2017 годзе);

закончаны ў 2017 годзе работы па рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Электрыфікацыя напрамку Маладзечна – Гудагай – дзяржаўная мяжа»;

пачалася рэалізацыя трэцяга этапу інвестыцыйнага праекта па аднаўленні парка паветраных судоў (заключаны дагавор на куплю трох паветраных судоў);

рэалізоўваліся інвестыцыйныя праекты па будаўніцтве другой штучнай узлётна-пасадачнай паласы і новага авіярэмонтнага завода ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» (пры ўдзеле ААА «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь»);

***<u>у сферы занятасці, сацыяльнай абароны насельніцтва і аховы здароўя:</u>***

утрамана на ўзроўні, ніжэйшым за планавы, афіцыйна зарэгістраванае беспрацоўе (пры парогавым значэнні 2 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва на 1 студзеня 2017 года – 0,8 працэнта, на 1 студзеня 2018 года – 0,5 працэнта);

аказана садзеянне ў арганізацыі прадпрымальніцкай, рамеснай дзейнасці, а таксама дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму з аказаннем фінансавай падртымкі шляхам прадастаўлення субсідыі штогод больш за 1,8 тыс. беспрацоўных;

з мэтай стымулявання працоўнай мабільнасці грамядзян аказана садзеянне ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы 287 сем’ям беспрацоўных (з іх у 2017 г. – 136 сем’ям);

аказаны сацыяльныя паслугі ў межах дзяржаўнага сацыяльнага заказу каля 4 тыс. грамадзян (у 2017 г. – 2,6 тыс.), дадатковая сацыяльная падрымка 25,8 тыс. ветэранам, пажылым грамадзянам і інвалідам (у 2017 г. – 11,4 тыс.);

стабілізавана смяротнасць працаздольнага насельніцтва (3,9 праміле) і агульная смяротнасць ад хвароб сістэмы кровазвароту (паводле папярэдніх звестак, 690 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва);

павялічана чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні да 74,4 гадоў пры плане 74,3 гады;

***<u>у сферы адукацыі:</u>***

уведзена ў эксплуатацыю 25 устаноў дашкольнай адукацыі (з іх 13 у 2017 г.) на 5 100 месцаў, што ў комплексе з іншымі прынятымі мерамі дазволіла стварыць дадатковыя месцы ва ўстановах дашкольнай адукацыі (у 2017 г. каля 8,8 тыс., у 2016 г. – 9,6 тыс. месцаў) і забяспечыць ахоп дзяцей ад 3 да 6 гадоў установамі дашкольнай адукацыі на ўзроўні 95,8 %.

павялічылася колькасць забяспечаных першым працоўным месцам выпускнікоў устаноў адукацыі, на якіх распаўсюджваецца размеркаванне (накіраванне на працу). У 2017 г. з гэтай катэгорыі накіравана на работу ў арганізацыі выпускнікоў з вышэйшай адукацыяй – 98,9 працэнта ад агульнай колькасці; з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй – 98,9 працэнта, з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй – 99,4 працэнта;

падрыхтавана для навукаёмістых, высокатэхналагічных вытворчасцей 16,2 тыс. рабочых з павышаным узроўнем кваліфікацыі (4-ы разрад і вышэй), што склала 53,1 працэнта ад агульнага выпуску;

***<u>у сферы развіцця культуры, фізічнай культуры і спорту, павышэння турыстычнай прывабнасці</u>:***

павялічана доля адрэстаўраваных і маючых адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне помнікаў архітэктуры, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (з 15 працэнта ў 2015 годзе да 22,7 працэнта ў 2017 годзе);

завершана рэканструкцыя і рамонт комплексу будынкаў і пабудоў кінастудыі «Беларусьфільм» (у 2017 годзе ўведзена ў эксплуатацыю);

пашыраны доступ да культурных даброт розных катэгорый насельніцтва, аб чым сведчыць павелічэнне колькасці наведванняў арганізацый культуры (у 2017 годзе прырост да ўзроўню 2015 года склаў 2,12 працэнта пры плане 2 працэнта);

дасягнута 25 месца Рэспублікі Беларусь у спартыўным рэйтынгу краін па алімпійскіх дысцыплінах. Гэтаму садзейнічалі вынікі выступленняў беларускіх спартсменаў на чэмпіянатах, Кубках, першыствах свету і Еўропы: заваявана 647 медалёў (у 2016 годзе – 542 медалі), у тым ліку 177 залатых, у алімпійскіх дысцыплінах на чэмпіянатах свету заваявана 8 медалёў;

павялічылася колькасць насельніцтва, уцягнутага ў сістэматычныя заняткі фізічнай культурай і спортам (больш за 2,19 млн. чалавек, або 23,1 працэнта насельніцтва краіны);

вырас да 201,9 млн. долараў ЗША экспарт турыстычных паслуг (на 41,3 млн. долараў ЗША больш, чым у 2016 годзе).

Па выніках 2017 года **выканана 268** з 327 **мэтавых і 44** з 51 **зводных мэтавых паказчыкаў**, пры гэтым усе запланаваныя значэнні атрымалася дасягнуць толькі ў межах Дзяржаўнай праграмы развіцця машынабудаўнічага комплексу Рэспублікі Беларусь на 2017 – 2020 гады.

На рэалізацыю дзяржаўных праграм у 2017 годзе **накіравана больш за 61 млрд. рублёў**, у тым ліку **з бюджэту – 17,4 млрд. рублёў**[2].

**Ахоп выдаткаў кансалідаванага бюджэту дзяржаўнымі праграмамі** ў справаздачным годзе склаў 60,2 % (у 2015 г. – каля15 %).

*Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады да канца пяцігоддзя запланавана павысіць ахоп выдаткаў бюджэту дзяржаўнымі праграмамі да 90 працэнтаў.*

[2] Паводле інфармацыі, прадстаўленай у справаздачах адказных заказчыкаў дзяржаўных праграм.

Справаздачы адказных заказчыкаў аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) у 2017 годзе разгледжаны на пасяджэннях **пастаяннай міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах.** Кожная справаздача ўключала ацэнку эфектыўнасці рэалізацыі праграмы (падпраграмы).

*Ацэнка эфектыўнасці рэалізацыі праграмы (падпраграмы) выконваецца адказнымі заказчыкамі ў межах гадавой справаздачы.*

*Методыка ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі праграмы вызначана з улікам яе спецыфікі і заснавана на супастаўленні фактычных і запланаваных значэнняў мэтавых, зводных мэтавых паказчыкаў і выкарыстаных фінансавых сродкаў.*

Побач з ацэнкай эфектыўнасці, прадстаўленай адказнымі заказчыкамі, міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах пры разглядзе справаздач аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) улічваліся дадатковыя крытэрыі, якія дазваляюць больш глыбока прааналізаваць рэалізацыю канкрэтнай дзяржаўнай праграмы. Так, улічваецца ступень выканання ўсіх мерапрыемстваў, аб’ёмы фінансавання (па ўсіх крыніцах), дасягненне планавых значэнняў паказчыкаў, у тым ліку на рэгіянальным узроўні, ступень рэалізацыі асобных падпраграмм.

**Міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах** з 20 праграм ацэнены як высокаэфектыўныя дзевяць праграм, эфектыўныя – шэсць праграм, сярэднеэфектыўныя – пяць (глядзіце табліцу ніжэй).

Вынікі рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржаўных праграм у 2017 годзе прааналізаваны на пасяджэннях міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах.

Зводная справаздача аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) у 2017 годзе, уключаючы ацэнку іх эфектыўнасці, разгледжана на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 22 мая 2017 года.

## Ацэнка эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм у 2017 годзе

| Высокаэфектыўныя | Эфектыўныя | Сярэднеэфектыўныя |
|---|---|---|
| Дзяржаўная праграма аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва | «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» | «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» |
| «Адукацыя і моладзевая палітыка» | «Будаўніцтва жылля» | «Навукаёмістыя тэхналогіі і тэхніка» |
| Дзяржаўная праграма развіцця фізкультуры і спорту | Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС | «Энергазберажэнне» |
| «Культура Беларусі» | Дзяржаўная праграма лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства | «Беларускі лес» |
| «Беларусь гасцінная» | Дзяржаўная праграма развіцця транспартнага комплексу | Дзяржаўная праграма па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог |
| «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае развіццё прыродных рэсурсаў» | «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» | |
| Дзяржаўная праграма развіцця фармацэўтычнай прамысловасці | | |
| Дзяржаўная праграма развіцця аграрнага бізнесу | | |
| Дзяржаўная праграма развіцця машынабудаўнічага комплексу | | |